83.3(0)941
С471

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Філалагічны факультэт

# СЛАВЯНСКІЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ

**VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа**

**1–3 лістапада 2007 г., Мінск, БДУ**

Зборнік навуковых артыкулаў

Репозиторий БарГУ

ПРАВЕРАНА
20
БІБЛІЯТЭКА БДУКМ

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. № 333 333

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2008

## ЗМЕСТ

*ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ*


**Уладзімір Кароткі (Мінск)**
ХРЫСЦІЯНСКАЯ ГІСТОРЫЯ І КУЛЬТУРА Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ..........3
**Таццяна Шамякіна (Мінск)**
САЦЫЯЛЬНЫЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ МІФЫ ЭПОХІ Ў ЛЮСТЭРКУ ПРОЗЫ ЯКУБА КОЛАСА..........8

***СЕКЦЫЯ 1***
***Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа ў нацыянальным і сусветным кантэксце***

**Жанна Белакурская (Мінск),**
**Валерый Белакурскі (Мінск)**
ТВОРЧАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ..........13
**Алена Белая (Баранавічы)**
УЛАСНАСЦЬ І ПРАБЛЕМА АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПОВЕСЦІ Я.КОЛАСА "АДШЧАПЕНЕЦ" і РАМАНА З.БЯДУЛІ "ЯЗЭП КРУШЫНСКІ")..........16
**Анатоль Верабей (Мінск)**
АДРАДЖЭНСКІЯ ТРАДЫЦЫІ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА..........21
**Святлана Грымута (Мінск)**
ПАЭЗІЯ ЯНКІ КУПАЛЫ І МАКСІМА БАГДАНОВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ ЭСТЭТЫЧНАЙ ІДЭІ КРАСЫ МАСТАЦТВА..........26
**Лідія Дорошко (Мінськ)**
РОЛЬ НЕОРОМАНТИЧНОЇ ІРОНІЇ В ПОЕТИЦІ ДРАМИ ЯНКИ КУПАЛИ „АДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ"..........30
**Вольга Казлова (Мінск)**
ДРУЖБА, ЗГАРТАВАНАЯ ВОГНІШЧАМ ВАЙНЫ І Ў КУЗНІ МІРНАЙ ПРАЦЫ..........34
**Жанна Капуста (Мінск)**
ЛІТАРАТУРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Я.КУПАЛЫ І Я.КОЛАСА Ў ТВОРЧЫХ ПРАКТЫКАХ "МАЛАДНЯКА" І "УЗВЫШША"..........38
**Алена Марчанка (Мінск)**
ВОБРАЗ ПАЛЕСКАЙ РАНІЦЫ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА "НА РОСТАНЯХ"..........42
**Ганна Мятліцкая (Мінск)**
ВОБРАЗЫ МІФАЛАГІЗАВАНЫХ ЖЫВЁЛ У ПАЭЗІІ ЯНКІ КУПАЛЫ НАШАНІЎСКАГА ПЕРЫЯДУ..........46
**Уладзімір Навумовіч (Мінск)**
КОЛАСАЎСКІЯ ТРАДЫЦЫІ ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ ЛІТАРАТУРНАГА ГЕРОЯ, ЖАНРУ, СТЫЛЮ Ў БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ. "НА ПРАСТОРАХ ЖЫЦЦЯ": КАЛЯ ВЫТОКАЎ..........49
**Любовь Турбина (Москва)**
«ТУТЭЙШЫЯ» ЯНКИ КУПАЛЫ И «ДНИ ТУРБИНЫХ» М. БУЛГАКОВА НА ПЕРЕПУТЬЯХ ИСТОРИИ. ОПЫТ СОПОСТАВЛЕНИЯ..........53
**Алена Шарапа (Мінск)**
НАВЕЛЫ ЯКУБА КОЛАСА: СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКАЙ СІТУАЦЫІ..........57
**Ала Шахнюк (Баранавічы)**
ВОБРАЗ ЛІРЫЧНАГА ГЕРОЯ Ў ПОЛЬСКАМОЎНЫХ САНЕТАХ ЯНКІ КУПАЛЫ..........62
**Алена Шыцько (Мінск)**
ТРАДЫЦЫІ М.ГОГАЛЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРЧАСЦІ Я.КОЛАСА І М.ГАРЭЦКАГА..........63

***СЕКЦЫЯ 2***
***Міфалогія – фальклор – літаратура: праблемы паэтыкі***

**Алесь Бельскі (Мінск)**
ЧАЛАВЕК–ДОМ–ЛЁС У БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРЧАСЦІ КАЗІМІРА КАМЕЙШЫ)..........67
**Татьяна Гордеёнок (Новополоцк)**
ГРАНИ РОМАНТИЧЕСКОГО СОЗНАНИЯ: РОЛЬ ДЕМОНИЧЕСКИХ СИЛ В СУДЬБЕ ЧЕЛОВЕКА (Л. ТИК, Г. ФОН КЛЕЙСТ)..........70
**Анна Жегало (Гродно)**
АРХЕТИП МИРОВОГО ДРЕВА В СКАЗАНИЯХ О ЧУДОТВОРНЫХ ИКОНАХ БОЖИЕЙ МАТЕРИ: МЕХАНИЗМЫ ИНТЕРФЕРЕНЦИИ ЯЗЫЧЕСКОГО И ХРИСТИАНСКОГО..........73
**Рыма Кавалёва (Мінск)**
ВОБРАЗ ЦАРА Ў АСПЕКЦЕ ПРАБЛЕМЫ КАЗКА–МІФ–РЭЧАІСНАСЦЬ..........78


Репозиторий БарГУ

сродкамі праўдзіва адлюстраваць не толькі жыццё і быт сялян роднай Мікалаеўшчыны, але і стварыць абагулены вобраз селяніна-беларуса таго часу.

Разам з тым, мова паэтычных твораў Якуба Коласа ў некаторай ступені адрозніваецца ад мовы прозы, у першую чаргу, рытміка-гукавымі, інтанацыйнымі характарыстыкамі, сістэмай сродкаў і прыёмаў мастацкага адлюстравання. Але і ў вершах, і ў прозе выразна праяўляецца гукавая і структурная будова жывога народнага маўлення. Сувязь з ім выяўляецца ў выкарыстанні фразеалагічных зваротаў, слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі і інш.

Значнае месца ў моўнай структуры ранніх твораў Коласа займаюць тропы: параўнанні, эпітэты, метафары, як агульнамоўныя, так і індывідуальна-аўтарскія. З іх дапамогай пісьменніку ўдалося выказаць глыбока асабістыя і адначасова агульначалавечыя пачуцці і жаданні.

Адметнай рысай мовы ранніх твораў з'яўляецца тое, што ў ёй арганічна аб'яднаны моўныя адзінкі жывой народнай і кніжнай мовы як на ўзроўні лексікі, так і на ўзроўні сінтаксічных канструкцый.

У ранніх творах Якуба Коласа не толькі праявілася імкненне пісьменніка да стварэння індывідуальнай сістэмы фіксацыі, замацавання і ўвасаблення жыццёвага матэрыялу, гэта значыць, індывідуальнай манеры пісьма, але і адлюстравалася ўздзеянне яго моватворчасці на працэс фарміравання і развіцця нацыянальнай агульнанароднай мовы, якая, як сцвярджаюць вучоныя, у перыяд ад 1905 да 1907 гг. набыла ўсе асноўныя рысы літаратурнай мовы [9, с. 49].

Аднак для таго, каб гэта мова магла ўспрымацца не як мова асобнай сацыяльнай групы людзей, а як мова цэлага народа, мова па-сапраўднаму культурная, неабходны былі глыбокія сацыяльныя змены ў грамадскім жыцці, у думках і пачуццях людзей. Неабходныя ўмовы для гэтага склаліся ў былой паўночна-заходняй частцы царскай Расіі ў пачатку ХХ стагоддзя. Іменна Якуб Колас і Янка Купала пачалі са сцвярджэння права мужыка "чалавекам звацца", з барацьбы за права мець літаратуру на роднай мове.

Такім чынам, у ранніх творах Якуба Коласа "мы сустракаемся са з'явай, выключнай у еўрапейскай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя, калі ідэя нацыянальнага Адраджэння выступае як феномен мастацкай літаратуры, як яе і светапоглядная, і ўласна мастацкая дамінанта [3, с. 159].

### ЛІТАРАТУРА


1. Адамовіч А. Шлях да майстэрства. – Мн., 1958.
2. Александровіч С.Х. Пуцявіны роднага слова. Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы ХІХ – пачатку ХХ стагоддзя. – Мн., 1971.
3. Вазнясенскі А. Ля вытокаў мастацкай прозы Я.Коласа// Полымя. – 1929. – №2.
4. Дегтерёва Т.А. Становление норм литературного языка. – М., 1963.
5. І.М. Мае ўвагі// Наша ніва. – 1912. – №32.
6. История белорусской дооктябрьской литературы / Под ред. Борисенко В.В. и др. – Мн., 1977.
7. Лойка А.А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. – Ч. 2. – Мн., 1980.
8. Погодин А. Белорусские поэты// Вестник Европы. 1911, №1.
9. Пытанні білінгвізму і ўзаемадзеяння моў. – Мн., 1982.
10. Хрaпунова Л.Г. Першыя беларускія чытанкі// Беларуская дзіцячая літаратура/ пад. аг. рэд. М.Б. Яфімавай і М.М. Барсток. – Мн., 1966.



*Алена Белая (Баранавічы)*


## УЛАСНАСЦЬ І ПРАБЛЕМА АСОБЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПОВЕСЦІ Я.КОЛАСА "АДШЧАПЕНЕЦ" І РАМАНА З.БЯДУЛІ "ЯЗЭП КРУШЫНСКІ")

Значнасць мастацкай літаратуры, сярод іншага, у тым, што многія пастаўленыя ў ёй пытанні традыцыйна адносяцца да сферы філасофіі, аднак форма выяўлення ідэй заўжды павялічвала ўспрымаючую іх аўдыторыю. На думку Р.Барта [1], літаратура "ахоплівае ўсе



Репозиторий БарГУ

...відаў ведаў: сацыяльныя, псіхалагічныя, гістарычныя... Навука выкладаецца, г. зн. ...ваецца, літаратура ж не столькі паведамляецца, колькі адбываецца".

Вядучая супярэчнасць сучаснага быцця – паміж сутнасцю чалавека і яго існаваннем. У гэтым пагрозлівым кантэксце робіцца глабальнай праблемай захаванне і развіццё асобы. Важнейшая задача XXI ст. – выкараненне беднасці, а гэта, у сваю чаргу, актуалізуе праблему ўласнасці. Як пісаў М.Бубер, "мець" і "быць" –... два фундаментальныя тыпы адносін да свету: для фізічнага існавання трэба мець, для духоўнага – быць"[2, с.5].

Сучасныя філасофскія даследаванні" [5] сведчаць, што генезіс уласнасці заключаецца не толькі ў біялагічнай прыродзе чалавека. Уласнасць – гэта сацыяльна-культурны феномен; яна ўздзейнічае на асобу як прадмет, адносіны, як правы і як каштоўнасць, уяўляючы сабой сістэму, для якой характэрна самарэгуляцыя і паўтаральнасць і сваіх форм, і тыпаў асобы, што ад іх залежаць. Асэнсаванню гэтага, разам з філасофіяй, здольна спрыяць і мастацкая літаратура.

Гістарычны працэс, сцвярджае М.Бубер, "у цэлым ёсць развіццё, развіванне цэльнай вяровачкі. Аднак прагрэс у прыватным дасягаецца часам...за кошт страты Галоўнага, страты сэнсу бясконца ўскладненага жыцця; і час ад часу Галоўнае даводзіцца знаходзіць нанава і сцвярджаць яго ў нейкай новай форме" [2, с.10]. Першая трэць XX ст., бясспрэчна, адзін з такіх складаных перыядаў. Асэнсаванне багатага і трагічнага вопыту нацыянальнага быцця, увасобленага ў мастацкіх творах гэтага перыяду, дае магчымасць больш плённага пошуку "Галоўнага" і захавання яго ў сучасных гістарычных варунках. Аналіз нацыянальнай класікі яшчэ раз пераконвае ў ісцінnасці думкі Р.Барта, што "ўсе ...адкрыцці гуманітарных навук ... былі вядомыя літаратуры заўсёды, розніца толькі ў тым, што яны ў ёй не гаварыліся, а пісаліся" [1]. Гэта ў поўнай меры датычыць праблемы ўзаемадачыненняў асобы і ўласнасці, якую мы разглядаем на матэрыяле аповесці Я.Коласа "Адшчапенец" і рамана З.Бядулі "Язэп Крушынскі".

Асоба – не проста сукупнасць грамадскіх адносін. Гэтыя адносіны яна праламляе праз унутранае "Я", свядомасць і падсвядомасць, з чаго вынікае разнастайнасць і шматграннасць асоб. Развіццё асобы – гэта супрацьборства і адзінства ўнутранага і знешняга. Як пісаў А.Маруа, "сапраўдны знешні свет – гэта сапраўдны ўнутраны свет." Літаратура адкрывае шлях у сапраўдны ўнутраны свет, ад якога залежыць сапраўдны знешні, а значыць – і прадухіленне трагічнага лёсу гэтага знешняга свету сёння праз асэнсаванне маральнага закона як адзінай умовы захавання жыцця [6]. Асоба валодае натуральным, "унутраным", пачуццём уласнасці; уласнасць як "знешняе" можа быць для асобы прадметам, адносінамі прысваення, адчужэння, правам, каштоўнасцю. . Яна "ўкладзена" ў чалавека, падказана яму прыродай, звязана з фізічным і духоўным "упарадкаваннем" асобы, яе інстынктамі, унутранымі матывамі. Гаспадарачы, чалавек не можа не зліваццa з аб'ектамі ўласнасці, ужываючыся ў іх, уключаючы ў сваё жыццё. Калі Мікіту, сына "адшчапенца" Пракопа Дубягі, "першы раз у жыцці апанаваў гаспадарскі клопат", то гэта надало яму сталасці, прымусіла "прыкідаць у мыслях..., на чым можна зрабіць эканомію," у галаве ў яго "борзда складаўся план гаспадарскіх работ на бліжэйшы час", – кажучы словамі Коласа, "гаспадар абудзіўся ў Мікіце ва ўвесь рост". [7, с.155].

Уласнасць разглядаецца і як вынік адносін, згоды ці нязгоды паміж людзьмі, групамі або дзяржавамі. У рамане З.Бядулі "Язэп Крушынскі" ўласнасць на зямлю якраз і вызначае характар такіх адносін: "Калі хочаш ведаць, хто з кім у прыязні, якія людзі злучаны ў адну масу, глядзі, хто з кім разам радуецца, хто з кім разам сумуе. <...> Вяскоўцы і хутаране ўпадобіліся старасвецкім шалям: адзін канец угару, другі ўніз – і наадварот..." [3, с.476].

У каштоўнасных адносінах да ўласнасці адлюстроўваецца неадпаведнасць паміж патрэбамі асобы і тымі рэаліямі, у якіх яна існуе. Вось у якой сітуацыі апынуліся героі З.Бядулі. Аддаўшы свой дом у камхоз, гарадскія браты Крушынскія "часта ... хадзілі-спацыравалі па вялікім падворку ... і заглядалі ва ўсе закуткі, у хлявы, у чужыя кватэры, ці



Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
ІНВ. № 333333
Рэпазіторый БарДУ

ўсё ў парадку, ці не трэба дзе рамантаваць. " Гаспадарчае" вока песціла кожны куток, балела за кожную адломаную цаглінку <...> Часта каму-колечы з братоў снілася, што прыйшла новая ўлада, у якой уласнасць – святая рэч, рэлігія" [3, с.309].

Разглядаемыя намі творы пацвердзілі і думку, што некаторыя элементы сістэмы ўласнасці ва ўмовах аднаго этапа існуюць як анамалія, як выпадковае, а ў іншых умовах аказваюцца неабходнымі. У прыватнасці, нам вядомы і такія этапы, калі пераважала грамадская ўласнасць, а прыватная з'яўлялася адхіленнем, хоць і мэтазгодным у канкрэтнай гістарычнай сітуацыі. "Каб жыў Ленін, дык трымаўся б за нэпу. Добрая была і разумная, гэта самая нэпа!" [4, с.199], – чытаем у З.Бядулі.Тое ж назіраецца і з тыпамі асобы. Р аспаўсюджаны тып заможнага селяніна , "абаротлівага, кемлівага чалавека, спрытнага гаспадара"[7, с.98], таксама зрабіўся анамаліяй, адхіленнем ад нормы. Вось як гаворыць аб гэтым Я. Колас: "...жылі сабе людзі ў згодзе, калі не лічыць дробных сварак, без якіх нідзе не абыдзешся. Былі бяднейшыя і багацейшыя, як хто стараўся і як паводзілася каму. Бяднейшы часам пабагацее, а багаты збяднее, калі надыдзе якое ліха.Не ведалі ніякіх кулакоў, ніякіх капіталістычных элементаў.А цяпер што стала? Падзялілі ўсіх на кулакоў, серадняков, беднякоў, батракоў, калгаснікаў і не калгаснікаў, навыдумлялі нейкіх рупараў і кулацкіх падпявалаў"[7,с.198].

Як казаў адзін з герояў рамана З.Бядулі, адметны мастацкі тып, "чалавек без знакаў прыпынку": " не трэба пераскокваць і абмінаць гістарычных шляхоў, як праз гнілыя калоды, пабачым што з усяго гэтага выйдзе" [4, с.87 ]. Рэальную ступень дэструкцыі, абумоўленай татальным вынішчэннем прыватнай уласнасці і звязаных з ёю сацыяльных тыпаў, можна ацаніць толькі сёння. Сучаснае грамадства цярпіць страты з той прычыны, што на тэрыторыі "перамогшага сацыялізму" ў свой час не быў сфарміраваны сярэдні клас, тая "нязначная меншасць," якая, на думку А.Дж.Тойнбі, "стварыла сённяшні свет" [9, с.278].

Уласнасць як прадмет – адзін з асноўных фактараў фарміравання, станаўлення асобы, перадумова яе індывідуальнасці. Гэта яскрава відаць на прыкладзе Язэпа Крушынскага, які праходзіў свае жыццёвыя універсітэты ў дзядзькі-ўласніка. "Я цябе на ногі паставіў... Стукнуў балванам аб падлогу, а стаіць чалавек", – не раз нагадваў дзядзька Язэпу [4, с.223]. Істотна, што ў "Заўвагах" да перавыдання рамана ў 1953 г. адзначалася: "Крытыкі РАППа... не зразумелі вобраза Крушынскага і доўгі час вінавацілі З. Бядулю ледзь не ў ідэалізацыі кулака." Аўтар адказаў на гэта так: "Я павінен зазначыць, што ўсе героі рамана і іхнія ўчынкі ўзяты мной непасрэдна з жыцця. Бадай усе натуршчыкі сябе пазнаюць. Цікава яшчэ тое, што пазнаюць сябе і такія, якіх я зусім не ведаў і не меў на ўвазе. Многія з чытачоў ... знаходзяць сваіх Крушынскіх і дзівяцца, скуль я іх ведаю..." Іншымі словамі, З. Бядуля адказаў на раппаўскую крытыку спасылкай на тое, што ён у вобразе Крушынскага тыпізаваў характэрную з'яву рэчаіснасці" [3,с.524].

Прыметай уласнасці як прадмета з'яўляецца магчымасць быць "сваім". Першым, самым старажытным, адным з "вечных" прадметаў уласнасці была і застаецца зямля, а поруч з ёй – свойская жывёла, сенажаці і інш. Цяжка ўсумніцца ў гэтым, назіраючы, як "Пракоп... ідзе ў хлеў <...> Скаціна лагодна, кожная на свой манер, вітае гаспадара простымі аднаскладовымі гукамі, што адпусціла для іх скупая прырода." "Асноўнаю прычынаю... гэтага візіту было якраз жаданне палюбавацца на сваю жывёлу" [7, с.97]. Разам са зменненнем прадмета ўласнасці чалавек развівае свае здольнасці, пачуцці, выпрацоўвае новыя якасці. Аднак у разнастайнасці пунктаў погляду на суадносіны ўласнасці і асобы існуюць тэндэнцыі абсалютызаваць адну з форм уласнасці і недаацэньваць усе яе іншыя формы, што склаліся гістарычна. На практыцы гэта, як правіла, вяло да дэфармацыі асобы, яе сацыяльнай трагедыі, чым з'явілася, у прыватнасці, раскулачванне. "Хаця "кулацкасць" многіх, – піша Я.Колас, – проста непаразуменне адно" [7, с.145]. Герой аповесці "Адшчапенец" Пракоп Дубяга, "як бы штосьці прыкідаючы ў сваім розуме, ...гаворыць да



Рэпазіторый БарДУ

цалуюнкі", якая ўвогуле "такая ўдалая","як родная дачка":" Зробіш ты мяне, воўчае мяса, кулаком! А карысці з цябе – кот наплакаў…"[7, с.96].

Калі чалавек губляе маральную, духоўна-інтымную сувязь з прадметам уласнасці, то адбываецца крызіс як матэрыяльнай, так і духоўнай сферы. Нездарма напярэдадні калектывізацыі вяскоўцы забіваюць скаціну, "п'юць, гуляюць, як перад пустым канцом, прагульваюць і зводзяць гаспадарку" [7, с. 99], бо надыходзіць час, у якім "батракі – самае пачэснае…званне" [7, с.193]

Прадукт уласнасці, яе прадмет схільны выклікаць у чалавека, акрамя адносін карысці, матэрыяльнай выгоды, яшчэ маральныя і эстэтычныя пачуцці, пачуццё гістарычных каранёў, далучанасці да продкаў і папярэднікаў, трываласці быцця. Амаль па-скарынаўску гучаць Коласавы радкі: "Шкада было старога котлішча і цесных закуткаў уласнага дворыка, дзе Пракоп так многа пакінуў свае працы, свайго жыцця" [7, с.116]. Іншаму герою, Цімоху, ягоны "хутарок быў так дараг…, асабліва цяпер, калі становішча … яго непэўнае, невыразнае, цёмнае і страшнае" [7, с.146].

Як ужо адзначалася, уласнасць лічыцца, з аднаго боку, прыроджанай якасцю чалавека, з другога – з'явай культуры, г.зн. выяўленнем маралі, эканомікі, права. Беларуская проза даследуемага намі перыяду засведчыла разнастайныя праявы двайной маралі, цесна звязаныя з праблемай уласнасці. Так, гарадскія браты Крушынскія "ў пераходныя часы ... у дакументах былі то дзецьмі багача-домаўласніка, то лёкая-пралетарыя. І першая, і другая бацькоўская годнасць была імі выкарыстана як найлепшая спадчына" [3, с.311]. Я.Колас у сваёй аповесці таксама не абмінае ўвагай таго, што ў сучасную яму эпоху "ў кожнага свая справядлівасць, свая праўда. Класавая справядлівасць"[7, с.190]. Аб'ектыўныя законы грамадскага развіцця маюць, між тым, тэндэнцыю набываць спецыфічныя рысы.Так, лозунг аб непазбежнасці класавай барацьбы, якая вынікае на грунце пераразмеркавання уласнасці, з цяжкасцю прыжываўся на беларускай глебе. Гэта арыгінальна паказана З.Бядулем: "…пачаўся ў ваколіцы падзел на багатых і бедных, ... але класавае пачуццё не мела патрэбнага развіцця... Мудрагельны, сплецены ланцуг крэўнасці... быў гэтаму адной з галоўных перашкод..." [3, с.233].

Уласнасць як адносіны выяўляецца ў шэрагу варыянтаў. Першы: можна валодаць прадметам уласнасці і не быць уласнікам. Другі: можна быць уласнікам, але валодаць прадметам толькі "умопостигаемо". Трэці – найбольш спрыяльны для асобы – валодаць прадметам уласнасці і рэальна, і "умопостигаемо" [5]. На этапе калектывізацыі якраз ён здаваўся утапічным. "Адзін гаспадар" у рамане "Язэп Крушынскі" скардзіцца: "Ведаеш, нейкі страх бярэ. Вось як пачнуць на сходзе гаварыць , дык здаецца, усё добра, лепш быць не можа. Ну, думаю, толькі ў калгасе мне і жыць. А як ... трэба ў агульны кацёл усё тое, што нажыў, дык нейкі страх нападае... Хто яго, братку, знае, што з усяго гэтага будзе?" [4, с.208]. Сам Крушынскі "адчуваў, што быць цяпер гаспадаром вялікага абшару зямлі – тое самае, што быць гаспадаром ветра ў полі" [3, с.206]. Жонка Пракопа Дубягі Тацяна таксама заўважае: "Невялікае шчасце быць цяпер багатым" [7, с.101]. Пракоп таксама вымушаны прызнаць, што і ён усё жыццё "збіраў дабро, як крумкач косці" [7, с.103].

Уласнасць выступае як права асобы на выбар адпаведнага віду дзейнасці, самавыяўленне і свабоду, што мае на ўвазе раздзяленне працы, якое ўздзейнічае на асобу, развіваючы яе схільнасці.Так, ва ўзорным калгасе Пракопа ўражвае " новы гаспадарскі дабрабыт", залог якога – правільна "арганізаваць рабочую сілу, кожнага паставіць на сваё месца" [7, с.126]. Невыкананне гэтай умовы цягне за сабою досыць непрадказальны для грамадства вынік. На думку К.Крапівы, "паставіць чалавека на месца" – вялікая справа. Менавіта з гэтай прычыны на свеце "перавядуцца калі-небудзь" дурні. Сатырык упэўнены, што "дурань не столькі прыродная з'ява, колькі сацыяльная: кожны дурань, калі яго паставіць на сваё месца, перастае быць дурнем <...> Дурань таму і блішчыць здалёк, што знаходзіцца не на сваім месцы…, і чым вышэй гэтае месца, тым смяшней выглядае



Рэпазіторый БарДУ

дурань, тым далей ён вілаў.". К.Крапіва выказвае надзею на тое, што "мы хутка зусім дасканала навучымся ўлічваць здольнасці і падрыхтаванасць чалавека да тае ці іншай працы" [8, с.437]. А пакуль, адзначаючы, што паведаная ім "гаспадарка – дзіўцца трэба", Пракоп Дубіга гаворыць: "тут як бы нешта людзі згубілі", "сабою і сваім часам не могуць распараджацца, як хочуць" [7, с.147-148]. Яго аднавяскоўцы небеспадстаўна асцерагаюцца, што ў калгасе "адзін будзе працаваць, а дзесятак туляцца ад работы…Свае меркаванні і сваю волю прыйдзецца ў кішэньку схаваць" [7, с.183]. Для героя відавочна, што "ў калгасе такім гаспадаром, як на сваім хутары, ты не будзеш і сваім адумам нічога зрабіць не здолееш. І працаю, здабыткам яе па-свойму не пакруціш" [7, с.148]. (Дарэчы, Якуб Колас з уласцівым яму гумарам паказаў перавагі хутарскога гаспадарання праз надзвычай красамоўную дэталь: у калгасе няма такіх кілбас, як гэта, "скручаная ў дзве столкі…, якою можна было б падперазаць самага тоўстага чалавека" [7, с.149].) Змест рэфлексій самых розных па характары і маёмасным становішчы герояў у мастацкай прасторы аповесці зводзіцца да наступнага: асоба бяспраўная, калі яна страчвае магчымасць выявіць сябе праз адносіны ўласнасці. "На сваёй гаспадарцы…сам сабе галава, сам сабе загадчык і камандзір…А ў калгасе што? Парабак – не парабак, батрак – не батрак, а волі свае не маю" [7, с.155]. Жыццёвую мудрасць беларусаў і іх талерантнасць у адносінах да перамен Я.Колас увасобіў у словах Пракопа: "Ну, раз вы хочаце ў калгас – ідзіце сабе…Не замінай жыць, хто хоча жыць па-новаму…Ну, жывеце сабе як хочаце, а я пагляджу…" [7, .159]. Адной з генеральных дамінант у тэксце аповесці "Адшчапенец", без перабольшвання, выступае лексема "самакрытыка", што, у сваю чаргу, сведчыць аб дамінаванні гэтай якасці ў структуры свядомасці прадстаўнікоў адлюстраванага ў творы соцыуму. Празмерная самакрытыка – паказчык неадэкватнай, заніжанай самаацэнкі асобы, таго, што асоба, яе індывідуальнасць не развіваецца У ідэале ж не формам уласнасці павінна падпарадкавацца асоба, а наадварот, "бо духоўны прагрэс канкрэтнай асобы нясе з сабой значна больш істотны сацыяльны прагрэс, чым нейкі іншы спосаб дасягнення гэтай мэты, бо ўсякая форма ўласнасці можа ўплываць на асобу і станоўча, і адмоўна. "Уласнасць, нажытая сумленна, выхоўвае, а накрадзеная – дэмаралізуе"(У.Калеснік).

Узровень развіцця здольнасцей асобы і багацце форм уласнасці знаходзяцца паміж сабой у непасрэднай сувязі. Праз прызму ўласнасці таксама могуць быць выяўлены погляды на праблему справядлівасці: усякая яе форма, якая спрыяе развіццю асобы, не можа лічыцца несправядлівай. Абедзве гэтыя тэндэнцыі адбіліся ў вобразе "муляра-мастака" па прозвішчы Лапко, які "ў сваёй творчасці ўнікаў "штампаў, "стараўся даць што-небудзь новае, арыгінальнае" [7, с.135] і лічыў, што найлепшая прэмія для яго – гэта калі "добра будзе" [7, с.139]. Да таго ж, "Лапко наогул быў чалавек лагодны, адзыўлівы на чужое гора"[7, с.143] – меў якасць не надта ўласцівую "новым людзям" і сам усведамляў гэта: "Трэба быць цвёрдым. А я – як кісель". З пункту ж погляду Пракопа (а ў ім бясспрэчна адбілася пазіцыя аўтара-гуманіста), "каб такія людзі былі…, то лёгка было б жыць на свеце…Вярнуся. Успомню, што ў калгасе ёсць такія людзі, …, і мне будзе весела, і ахвота знойдзецца ў калгасе працаваць"[7, с.161]. Аднак хутка Лапко зрабіўся "непрыдатным героем сённяшняга дня" [7, с.166], бо, па словах аднаго з выступоўцаў, "такую дабрату вытручваць трэба" . Гэта ж абяцае сходу і сам селянін: "Натура мая, – тут Лапкоў голас загучэў злосцю: –паршывая натура! Але я зламлю яе!" [7, с. 170-171]. Тут ва ўсёй паўнаце паўстае трагедыя індывідуальнасці ў таталітарным грамадстве. "Індывідуальнасць ёсць жамчужына найвялікшай маральнай каштоўнасці, і наколькі ж глыбокае маральнае падзенне грамадства, калі гэтую жамчужыну утоптваюць у гразь" [9, с.426], – прычым, што самае агіднае, яе ж уласнымі намаганнямі.

Такім чынам, уласнасць, якая ўзнікла першапачаткова як натуральная з'ява, паступова трансфармавалася ў сацыякультурны феномен. Праз асэнсаванне пачуцця ўласнасці фарміруецца псіхіка чалавека і яго сацыяльныя якасці. Адрознасцю і разнастайнасцю

Репозиторий БарГУ

гэтых пачуццяў абумоўлена шматстайнасць культурных узораў грамадства, у тым ліку нацыянальных, да якіх у поўнай меры адносяцца і мастацкія тыпы. Беларуская проза 1-й трэці XX ст. і ў самых неспрыяльных умовах не ўхілялася ад паказу праблем, звязаных са зменай форм уласнасці, якая пазбаўляла асобу права на свабоду самавыяўлення, магчымасці быць гаспадаром свайго лёсу. Для прааналізаваных намі твораў характэрна тое, што ў іх амаль няма "сацыяльных тыпаў у чыстым выглядзе", пераважаюць амбівалентныя характары як вынік прызнання аўтарамі складанасці і ўнутранай супярэчлівасці чалавека, шматкроць акумуляванай складанасцю эпохі. Ва ўмовах татальнай "самакрытыкі" абодва празаікі пакінулі за сваімі героямі права на "няпоўную шчырасць" (Я. Колас) як апошняе сховішча цэласнасці асобы ў час яе гвалтоўнага адчужэння ад уласнасці як матэрыяльнай і духоўнай сутнасці быцця.


ЛІТАРАТУРА

1.Барт, Р. От науки к литературе / Р.Барт / http: // www. biometrica / tomsk. ru / ftp / culture / bart. htm

2.Бубер, М. Два образа веры: Пер. с нем. / Под ред. П.С.Гуревича и др. – М.: Республика, 1995. – 464 с.

3.Бядуля, З. Язэп Крушынскі / З. Бядуля Збор твораў. У 4т. Т.3. Раман. Кніга 1 // Дзярж. выд-ва БССР; Рэдакцыя маст. літ-ры. – Мінск, 1953. – С.167 – 522

4. Бядуля, З. Язэп Крушынскі / З. Бядуля. Збор твораў. У 5 Т.

Т.5. Раман. Кніга 2 // Мінск: Маст. літ., 1989. – С.5 – 249

5. Захарова, Л.Н. Собственность и личность / Л.Н.Захарова / Автореф. дис…д-ра филос. наук:22.00.06 / Тюмен. гос. ун-т. – Тюмень, 1998. – 28 с.

6.Зурабов, А. Иначе не выжить…/ А. Зурабов. // Литературная газета. – 29 августа – 4 сентября 2007 г. – С. 1

7.Колас, Я. Адшчапенец / Я.Колас. Збор твораў. У 7 т. Т. 6. // Дзярж. выд-ва БССР: Рэд. маст. літ. – Мінск, 1952. – С. 93 – 202

8.Крапіва, К. Што мне рупіць / К.Крапіва. Збор твораў. У 3т. Т.2. Проза. - Дзярж. выд-ва БССР; Рэдакцыя маст. літ-ры. – Мінск, 1956. – С.435 –

9.Тойнби, А. Дж. Цивилизация перед судом истории: Сборник / Пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Айрис-пресс, 2003. – 592 с.



*Анатоль Верабей (Мінск)*


# АДРАДЖЭНСКІЯ ТРАДЫЦЫІ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Янка Купала і Уладзімір Караткевіч шмат зрабілі для адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і гістарычнай памяці беларусаў.

Я. Купала быў адным з любімых беларускіх пісьменнікаў У.Караткевіча. Думаецца, невыпадкова першымі публікацыямі У.Караткевіча, што з'явіліся ў 1955 годзе ў беларускіх рэспубліканскіх выданнях і што істотна паўплывалі на яго творчы лёс, сталі верш "Машэка" (часопіс "Полымя", № 7) і нарыс "Вязынка" (кніга "Янка Купала. Зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці паэта"). Пазней ён пісаў пра песняра ў артыкулах "Пакуль гэта сэрца б'ецца" (1962), "Зліццё з душой народнай" (1982), вершы "Дзень першы" (1958), п'есе "Калыска чатырох чараўніц" (1981) і іншых творах.

Ідэя нацыянальнага адраджэння роднага краю была вызначальная для Я. Купалы. У сваіх вершах ён паэтызаваў, узвялічваў і сцвярджаў чалавечую годнасць мужыка, абуджаў яго ("Мужык", "Я мужык-беларус...", "Што ты спіш?.."). Ад вобраза мужыка паэт ішоў да адкрыцця беларускага народа ("А хто там ідзе?"), маладой Беларусі ["Маладая Беларусь" ("Вольны вецер напеў вольных песень табе...")]. Паэт самаахвярна служыў роднай зямлі, разважаў пра яе гістарычны лёс, марыў пра яе шчаслівую будучыню ў вершах "Грай, мая жалейка...", "Там", "Ворагам Беларушчыны", "Мая малітва", "Гэй, наперад!", "Нашай ніве" ("Не загаснуць зоркі ў небе..."), "Песня званара", "Над Нёманам", "Цару неба й зямлі", "Годзе...", "Выйдзі...", "Бацькаўшчына", "Паязджане" і інш. Яго вершы вызначаліся патрыятычным пафасам, лірызмам, філасафічнасцю, трагедыйным і адначасова жыццесцвярджальным гучаннем.


Рэпазіторый БарДУ